УДК 94:728.83(476.4-37Бабруйск):929

# ЖЫЛІЦКІ ПАЛАЦ ЯК АБ'ЕКТ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***І. А. Журненка*** (ГДУ імя Ф. Скарыны)
Навук. кір. ***Н. В. Корнікава***,
ст. выкладчык

У 2023 г. была завершана рэстаўрацыя Булгакаўскага палаца ў весцы Жылічы Магілеўскай вобласці, якая цягнулася з 2009 года. Палацава-паркавы ансамбль усе больш карыстаецца папулярнасцю ў турыстаў і ўжо заняў свае ганаровае месца сярод аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

У 1830-х гг. бабруйскі маршалак Ігнат Булгак пабудаваў сядзібу ў Жылічах на рацэ Дабосне. Спачатку быў узведзены П-падобны корпус, у 1864–76-х гг. пабудаваны двухпавярховы флігель з царквой, утварыўшы паўадкрыты двор. Заходняя частка дабудавана ў 1914-м г. Пасля смерці Ігната ў 1848-м г. сядзіба перайшла да яго сына Эдгара, які завяршыў будаўніцтва. Пасля рэвалюцыі 1917 ў палацы дзейнічалі дзіцячы дом і тэхнікум. У Другую сусветную вайну былі зруйнаваны аранжарэя і флігель, а з палаца зрабілі шпіталь. Пасля вайны тут дзейнічала сельскагаспадарчая школа. Ужо ў 1973 г. быў распрацаваны план рэканструкцыі. З 1996 г. тут дзейнічаў музей і музычная школа. А. І. Лакотка піша: «Ансамбль уключаў палац, флігель, гаспадарчыя пабудовы і парк. Да нашага часу захаваліся палац (належаў памешчыкам Булгакам, пабудаваны па праекце архітэктара К. Падчашынскага) і парк (плошча 18 га)» [1, с. 619]. Асаблівую ўвагу трэба надаць парку. У парку раслі экзатычныя віды дрэў (лістоўніца еўрапейская, клен серабрысты, ясень пенсільванскі і інш.) і дэкаратыўныя (напрыклад, дуб звычайны пірамідальны) [2, с. 201]. Сам ансамбль называюць «беларускім Версалем», дзякуючы яго надзвычайнай прыгажосці, што ўражвае. У палацы пазней размесцяцца музей, гасцініца і бібліятэка.

Такім чынам, аднаўлены маентак, дзякуючы музейнай экспазіцыі і створанай на яго тэрыторыі інфраструктуры, з'яўляецца прывабным турыстычным аб'ектам для знаемства з гісторыяй і адпачынку і мае ўсе шанцы стаць турыстычнай перлінай Магілеўшчыны.

**Літаратура**

1. **Туристическая мозаика Беларуси** / А. И. Локотко [и др.] ; науч. ред. А. И. Локотко. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 639 с.

2. **Туристская энциклопедия Беларуси** / под общ. ред. И. И. Пирожника. – Минск : Беларуская энцыклапедыя, 2007. – 647 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова